Евсеенко И.В., учитель белорусского языка и литературы
Аниськова С. М., доцент кафедры белорусского языка ГГУ им. Ф. Скорины

# ВОДГУК НА МАСТАЦКІ ТВОР У КАНТЭКСЦЕ АЛІМПІЯДНАЙ РАБОТЫ З ВУЧНЯМІ

Важнейшай часткай пазакласнай работы па беларускай мове і літаратуры з’яўляецца алімпіядная работа, якая ставіць на мэце выяўленне адораных і таленавітых вучняў і стымулюе фарміраванне станоўчай матывацыі працэсу навучання. Так, перамога на абласным узроўні – гэта магчымасць атрымаць сертыфікат з максімальнай колькасцю балаў пры паступленні на розныя спецыяльнасці, а перамога на заключным (рэспубліканскім) этапе алімпіяды дае і рэальны шанс паступіць без экзаменаў на адпаведнае аддзяленне філалагічнага факультэта любой вышэйшай навучальнай установы Рэспублікі Беларусь.

Традыцыйна алімпіяда праводзіцца ў некалькі этапаў:

1) лінгвістычны конкурс;

2) водгук на мастацкі або публіцыстычны твор;

3) вуснае выказванне.

Бадай, самым складаным, па меркаванні вучняў, відам алімпіяднай работы з’яўляецца напісанне водгуку, паколькі, з аднаго боку, нельга прадбачыць, які менавіта твор будзе прапанаваны для аналізу (яго жанравую спецыфіку, праблематыку, ідэйную скіраванасць, час напісання, аўтарства, грамадскі рэзананс). З другога боку, водгук незалежна ад пералічаных вышэй аспектаў аналізу – гэта заўсёды від творчай працы, таму колькі б метадычных парад вучань ні атрымаў, у многім поспех на гэтым этапе спаборніцтва будзе абумоўлены яго асабістай здольнасцю працаваць крэатыўна, не па шаблоне.

Як сведчыць вопыт працы з алімпіяднікамі, вучні ў цэлым валодаюць неабходным арсеналам тэарэтычных ведаў, што прапануе методыка, адносна таго, якія патрабаванні прад’яўляюцца да такога віду работ. Аднак на практыцы далёка не заўсёды ўсё атрымліваецца, а некаторыя звесткі з тэорыі так і не трансфармуюцца ва ўменні і навыкі. Безумоўна, неабходна практыкавацца і практыкавацца. І на гэтым шляху толькі эмпірычна, крок за крокам, можна навучыцца пазбягаць асноўных недахопаў, сярод якіх найбольш пашыранымі з’яўляюцца наступныя:

– механічны пераказ тэксту;

– няправільнае разуменне праблематыкі твора;

– адсутнасць вызначэння аўтарскай пазіцыі;

– абмежаванасць чытацкага вопыту;

– павярхоўнае асэнсаванне сюжэтных ліній твора;

– памылковая інтэрпрэтацыя вобразных сродкаў або іх схематычнае пералічэнне без указання стылёвых функцый;

– непрадуманасць кампазіцыі (зацягнуты ўступ, адсутнасць заключэння, парушэнне лагічнай паслядоўнасці выкладу);

– адсутнасць уласных меркаванняў;

– моўныя хібы;

– падмена арыгінальнасці “арыгінальнічаннем” пры выбары формы ў цэлым для водгуку або ў спосабе выкладу думак.

На наш погляд, найбольш прыдатнай формай для напісання водгуку з’яўляецца разважанне – функцыянальна-сэнсавы тып маўлення, які прадугледжвае лагічна паслядоўны рад думак, суджэнняў, высноў на якую-небудзь тэму. Абавязковая прымета разважання – наяўнасць асноўнай думкі праблемнага характару і аргументацыі, разгорнутай сістэмы пераканання адрасата ў справядлівасці асноўнай думкі.

Мяркуем, што структура разважання (тэзіс – аргументы – доказ – выснова) можа быць трывалым лагічным падмуркам для кампазіцыі водгуку. Так, тэзіс як думку, што патрабуе доказу, пажадана размясціць ва ўступе, сам доказ з выкарыстаннем аргументаў – у асноўнай часцы, а выснову – у заключэнні. Арыгінальнасць водгуку нам бачыцца, па-першае, у магчымасці арганічна знітаваць усе часткі, абраўшы нешаблонную мадэль іх прэзентацыі; па-другое, у індывідуальным адборы саміх аргументаў; па-трэцяе, у магчымасці разважаць крэатыўна з апорай на нестандартны фактычны матэрыял.

Асаблівага акцэнту патрабуе зачын – першыя некалькі сказаў ва ўступе, мэта якіх – “зачапіць” увагу, абудзіць цікавасць да напісанага неардынарным чынам. Тут на дапамогу вучню могуць прыйсці:

– парцэляцыя;
– прыказкі і прымаўкі;
– крылатыя выразы;
– цытаты;
– рытарычныя пытанне;
– рытарычны зварот;
– выразы на латыні;
– прытчы;
– сюжэты з Бібліі.

Мэта асноўнай часткі – усебакова прааналізаваць твор на ўзроўні як зместу, так і формы. Тут пажадана:

– раскрыць тэму, даказаць (а не проста канстатаваць) яе актуальнасць з апорай на кантэкст праз вызначэнне аўтарскай пазіцыі;
– паказаць праблему ў яе развіцці, у сувязі з гісторыяй беларускага народа, народаў свету;
– правесці культуралагічныя або літаратуразнаўчыя паралелі;
– прааналізаваць назву твора;
– вызначыць асноўныя канцэпты, вакол якіх будуецца аповед, аднак не захапляцца залішняй дэталізацыяй;
– ахарактарызаваць асаблівасці кампазіцыі;
– прааналізаваць тропы і сінтаксічныя фігуры з улікам іх стылёвых функцый і ролі ў стварэнні індывідуальна-аўтарскага стылю;
– выказаць уласныя меркаванні.

У працэсе працы над асноўнай часткай водгуку вучань павінен адказаць на наступныя пытанні:

1) Не пра што піша аўтар, а чаму менавіта пра гэта?

2) Не як піша аўтар, а чаму менавіта так? Як гэта спрыяе раскрыццю аўтарскай задумы?

3) Хто яшчэзвяртаўся да гэтай праблемы, закранутай аўтарам?

4) Якія шляхі вырашэння праблемы прапануе пісьменнік?

5) Што я думаю пра гэта? Шчыра! Без хлусні!

Асаблівую ўвагу вучняў неабходна звяртаць на абавязковую наяўнасць заключэння, дзе найчасцей традыцыйна падводзяцца вынікі, падагульняюцца думкі, выказаныя у галоўнай частцы, пры неабходнасці ставяцца пэўныя задачы на перспектыву. Тут таксама можна ўзмацніць  уяўны камунікатыўны кантакт праз апеляцыю да пачуццяў. Апошнія словы водгуку павінны быць яркімі, выразнымі, запамінальнымі. Як сведчыць народная мудрасць, канец – справе вянец.